**МІНСКІ ГАРАДСКІ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ**

пр. Незалежнасці, 8, 220030, г. Мінск
Тэл./факс (017) 218 00 90, 327 68 66
Р/р BY86BLBB36040100621571001001
у Дырэкцыі ААТ « Белінвестбанка »
па г. Мінску і Мінскай вобласці,
БІК BLBBBY2X

**МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**

пр. Независимости, 8, 220030, г. Минск
Тел./факс (017) 218 00 90, 327 68 66
Р/с BY86BLBB36040100621571001001
в Дирекции ОАО « Белинвестбанка »
по г. Минску и Минской области,
БИК BLBBBY2X

14.09.2020 № 6-7-4328 эл

На № __________ ад ________________

(для інфармавання зацікаўленых)

Аб разглядзе звароту

Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт у дадатак да раней напраўленага адказу ад 29.06.2020 № 6-7-4328-эл на Ваш зварот ад 27.05.2020 паведамляе.

Існуючая Канцэпцыя гарадской сістэмы прасторавага арыентавання пешаходаў (у т.л. турыстаў) у г.Мінску была адобрана рашэннем Мінгарвыканкама ад 24 снежня 2009 г. № 3080. Прычынамі дэмантажу трохбаковых вулічных стэндаў (далей – стэнды) грамадскага аб’яднання «Беларуская асацыяцыя экспертаў і сюрвеераў на транспарце» з’явіліся: неналежны эстэтычны выгляд канструкцый, парушэнне аб’яднаннем заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб рэкламе. Вышэй названыя стэнды пагаршаюць архітэктурнае аблічча будынкаў (збудаванняў), забудовы тэрыторыі ў парушэнне патрабаванняў п.7 Палажэння аб парадку размяшчэння сродкаў вонкавай рэкламы, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 12.11.2007 № 1497. Акрамя гэтага стэнды не адпавядаюць тэхнічным параметрам размяшчэння сродкаў вонкавай рэкламы і рэкламна-інфармацыйнага афармлення ў г.Мінску, не забяспечваюць функцыянальных і мастацка-эстэтычных якасцей аб’ектаў горада, фарміравання паўнавартаснага і эстэтычна выразнага асяроддзя абітання ў парушэнне патрабаванняў арт. 11, 65 Закону Рэспублікі Беларусь «Об архитектурной, градостроительной и строительной деятельности в Республике Беларусь».

У г.Мінску праводзіцца комплекс мерапрыемстваў па фарміраванню асабістага стылю і яго пазнавальнага міжнароднага аблічча для папулярызацыі сталіцы Рэспублікі Беларусь сярод замежных турыстаў, ідзе распрацоўка інавацыйнай стратэгіі фарміравання асабістага стылю г.Мінска ў адпаведнасці з Нацыянальнай стратэгіяй развіцця турызму ў Рэспубліцы Беларусь да 2035 году.

З улікам дадзеных мерапрыемстваў і ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у г.Мінску будуць удасканалены вулічныя інфармацыйныя пункты, схемы пешаходнай турыстычнай навігацыі, што атрымае адлюстраванне пры рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Беларусь гасцінная» на 2021-2025 гады.

У адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18.07.2011 № 300-З «Об обращениях граждан и юридических лиц» у выпадку нязгоды з атрыманым адказам Вы маеце права абскардзіць яго ў судзе ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

Намеснік старшыні А.В.Дараховіч

Касач 334 65 64